20. Cultural interaction between East and West. Archaeology, artefacts and human contacts in Northern Europe. – Stockholm: Stockholm Univ., 2007. – 366 p.
21. *Edberg, R.* Vägen till Paltteskiuborg / R. Edberg. – Sigtuna: Sigtuna Museer, 2001. – 42 s.
22. *Edberg, R.* Färder i österled: experiment, källor, myter och analogier / R. Edberg. – Stockholm: Dept. of Archaeology, Univ. of Stockholm, 2002. – 134 p.
23. *Androshchuk, F.* Vikings in the East: essays on contacts along the road to Byzantium, 800–1100 / F. Androshchuk. – Uppsala: Uppsala Univ., 2013. – VIII, 272 p., [83] il. – (Acta Universitatis Upsaliensis, Studia Byzantina Upsaliensia; 14).
24. *Франклин, С.* Начало Руси, 750–1200: перевод / С. Франклин, Д. Шепард; под ред. Д. М. Буланина. – СПб.: Д. Буланин, 2000. – 669 с.
25. *Shepard, J.* The Viking Rus and Byzantium / J. Shepard // The Viking world / ed.: S. Brink, N. Price. – New York, 2008. – P. 496–516.
26. *Цукерман, К.* Перестройка древнейшей русской истории / К. Цукерман // У истоков русской государственности: к 30-летию археологического изучения Новгородского Рюрикова Городища и Новгородской областной археологической экспедиции: ист.-археол. сб.: материалы междунар. науч. конф., Великий Новгород, 4–7 окт. 2005 г. / Новгор. гос. ун-т; отв. ред.: Е. Н. Носов, А. Е. Мусин. – СПб., 2007. – С. 343–351.
27. *Катлярчук, А.* Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў = Svenskar i vitrysk historia och kultur / А. Катлярчук. – 2-е выд., папраўл. і дап. – Вільня: Ін-т беларусістыкі, 2007. – 303 с.

**(Дата подачи: 23.02.2018 г.)**

*А. Ф. Самусік*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск
*A. F. Samusik*
Belarusian State Economic University, Minsk

**УДК 37(476)(091)«15/16»**

# ЗАМОЙСКАЯ АКАДЭМІЯ Ў АДУКАЦЫЙНАЙ СПРАВЕ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТ.

# THE ZAMOJSKI ACADEMY IN THE EDUCATIONAL WORK IN BELARUS AT THE END OF XVI – FIRST HALF XVII CENTURIES

*Артыкул прысвечаны нераспрацаванай у айчыннай гістарыяграфіі праблеме ўздзеяння Замойскай акадэміі на адукацыйную справу Беларусі ў канцы XVI – першай палове XVII ст. Разгледжаны прычыны стварэння гэтай навучальнай установы, арганізацыя тут вучэбна-выхаваўчага працэсу і яго метадычнае забеспячэнне. Асобная ўвага сканцэнтравана на аналізе адносін да акадэміі з боку розных канфесій (пратэстанты, уніяты, праваслаўныя і каталікі) з вызначэннем іх спецыфікі і прывядзеннем канкрэтных прыкладаў навучання ў Замосці выхадцаў з тэрыторыі Беларусі рознага веравызнання.*

*Ключавыя словы: Замойская акадэмія; вышэйшая адукацыя; антычная спадчына; рыторыка; правазнаўства; канфесіі.*

*The scientific article is devoted to undeveloped in national historiography problem of exposure zamojski academy for educational work of Belarus at the end of XVI – first half XVII centuries. The reasons for the creation of the institution, the organization is the educational process and methodological support. Special attention was focused on the author's analysis*

*of the relation to the Academy from different confessions (Protestants, Uniates, Orthodox and Catholics) the definition of their specificity and the concrete examples of training in Zamosc natives of the territory of Belarus of different faiths.*

*Key words: The Zamojski Academy; higher education; ancient heritage; rhetoric; jurisprudence; confessions.*

Другая палова XVI ст. для Польшчы і ВКЛ стала перыядам хуткага развіцця адукацыйнай справы, адметнасць якой заключалася ў яе поліканфесійным характары. Езуіцкія калегіумы тут суседнічалі з калоніямі Кракаўскага ўніверсітэта, праваслаўнымі брацкімі школамі, кальвінскімі, лютэранскімі ды антытрынітарскімі вучылішчамі, а ў пачатку наступнага стагоддзя да іх далучыліся ячшэ і ўніяцкія семінарыі. Усе яны прытрымліваліся пашыранага тады граматычна-рытарычнага напрамку навучання, што дазваляла пры жаданні вучыцца ў іх прадстаўнікам усіх канкурыруючых паміж сабою хрысціянскіх рэлігій.

Асобнае месца ў гэтай старакатай сістэме асветы належыла Замойскай акадэміі пад Люблінам у Польшчы, якая была ўтворана ў 1593–1595 гг. канцлерам каронным Я. Замойскім. У маладосці ён не толькі атрымаў бліскучую адукацыю ў Парыжы, Страсбургу і Падуе, але ў апошнім з пералічаных гарадоў быў нават абраны на пасаду рэктара мясцовага ўніверсітэту. Вярнуўшыся ж на Радзіму магнат акрамя іншага імкнуўся палепшыць агульны ўзровень адукаванасці айчыннага грамадства ды аслабіць міжканфесійнае супрацьстаянне, з пачаткам Контррэфармацыі набыўшае ў Рэчы Паспалітай больш вострую форму. Менавіта азначаныя задачы і сталі, па яго задумцы, прыярытэтнымі для Замойскай акадэміі, прызначанай канцлерам для вучнёўскай моладзі незалежна ад яе рэлігійнай прыналежнасці [1, с. 3–4].

Пры падобным падыходзе яна аказалася запатрабаванай і для ўраджэнцаў Беларусі, якія ўдасканальвалі тут уласныя веды, атрыманыя на Радзіме. На жаль, нягледзячы на гэта, дзейнасць Замойскай акадэміі ў азначаны час, а таксама вучоба ў ёй прадстаўнікоў айчыннай шляхты ды мяшчанства так і не сталі прадметам асобнага аналізу ў айчыннай гістарыяграфіі, што надае дадзенаму артыкулу навуковую навізну і актуальнасць.

Падрыхтоўка да адкрыцця Замойскай акадэміі была распачата яе ўплывовым фундатарам у 1593 г., а праз год – 29 кастрычніка 1594 г. – папа рымскі Клімент VIII уласнай булай даў её правы ўніверсітэта і дазволіў прысуджаць ступені доктараў філасофіі, права і медыцыны. Урачыстае адкрыццё акадэміі адбылося 15 сакавіка 1595 г., а праз два месяцы сюды былі залічаны першыя студэнты. Па штату 1601 г. у акадэміі працавалі прафесары аналогіі і граматыкі, рыторыкі, паэтыкі і сінтаксісу, грамадзянскага і польскага права, маральнай філасофіі, фізікі, логікі і метафізікі, матэматыкі. Колькасць прадметаў, аднак, тут была куды большай – таксама выкладаліся агульная гісторыя з акцэнтам на польскую, абавязкі грамадзяніна і чалавека, медыцына і г. д. Пры гэтым акцэнт рабіўся на свецкіх навуках, а багаслоўскія прадметы доўгі час увогуле адсутнічалі ў праграме [2, с. 8, 13–20].

З улікам свайго ўніверсітэцкага статусу Замойская акадэмія дзялілася спачатку на тры факультэты (вызваленых мастацтваў, права і медыцыны), да якіх толькі ў 1648 г. далучыўся тэалагічны факультэт. Кіравалі ёй рэктар і дэкан (адказваў за вучэбную частку), якіх штогод абіралі ўсе прафесары і 5 студэнтаў старэйшых класаў (ад кожнай з «нацый» – польскай, русінскай, ліцвінскай, пруска-лівонскай ды замежнай). Лічба ж выхаванцаў тут ніколі не была даволі высокай з прычыны дзейнасці па-суседству ад яе езуітаў (Люблін, Яраслаў) ды Кракаўскага ўніверсітэта: у 1598 г. іх тут налічвалася 32, у 1608 г. – 118, у 1609 г. – 67, у 1616 г. – 36, у 1650 г. – 49 (шляхта складала 15–20 %) [3, с. 337–338].

Пераходзячы да разгляду метадычнага забеспячэння вучэбнага працэсу ў Замойскай акадэміі, неабходна адзначыць, што яно традыцыйна грунтавалася на творах Арыстоцеля, Галена, Гамера, Герадота, Платона, Эўкліда і інш. Разам з тым, дзякуючы фінансавай падтрымцы Я. Замойскага і яго пераемнікаў, гэтая навучальная ўстанова здолела сабраць добраадукаваных выкладчыкаў, якія распрацавалі ўласны комплекс падручнікаў па шэрагу дысцыплін.

Распачаў азначаную справу Я. Урсын, напярэдадні заснавання акадэміі працаваўшы прафесарам матэматыкі і астраноміі ў Кракаўскім універсітэце. Ён быў аўтарам лацінскай граматыкі (Львоў, 1592), якая ў Замосці была перадрукавана ў 1619 і 1640 гг. і вызначалася даступнасцю выкладання матэрыялу і асобнай увагай польскай арфаграфіі [4, с. 13–17]. Разам з тым яе буйны памер (400 стар.) паспрыяў таму, што адразу ж пасля прыбыцця ў акадэмію Я. Урсын распачаў працу над больш скарочаным варыянтам. Ён выйшаў у 1594 і 1595 гг., але аўтарам тут быў пазначаны рымскі навуковец IV ст. Э. Данат, бо «Мастацтва граматыкі» апошняга захоўвала ўсеагульнае прызнанне, а яго імя яшчэ з часоў сярэднявечча стала нарыцацельным. Замойскі дапаможнік прытрымліваўся традыцыйнай схемы – спачатку разглядаліся часціны мовы, а потым даваліся парады ды правілы па іх ужыванні. Прызначаўся ён і для вывучэння рыторыцы – напрыканцы кнігі быў змешчаны разгляд Я. Урсынам твора Г. Ю. Цэзара «Аб аналогіі», дзе аналізаваўся трактат Цыцэрона «Аб аратары» [5, с. 77–87].

Цытаваўся Цыцэрон у Замосці і пры вывучэнні іншых прадметаў (філасофіі, права, медыцыны). Магчыма, гэта стала дзякуючы падручніку тутэйшага рэктара, доктара філасофіі А. Бурскага (1604). Акрамя тэкстаў Цыцэрона (у тым ліку на старажытнагрэчаскай мове), у ім меліся значныя па памерах каментарыі складальніка, што і дазваляла выкарыстоўваць яго на занятках па розных дысцыплінах. Прычым, па прызнанні самаго А. Бурскага, пры іх напісанні ён ужываў канспекты Я. Замойскага часоў знаходжання таго ў Падуанскім універсітэце [6, с. 35–47].

Вяртаючыся ж да рыторыкі, неабходна адзначыць, што менавіта выкладанне гэтага прадмета ў Замойскай акадэміі набыло арыгінальны характар, што праявілася ў імкненні мясцовых прафесараў адрадзіць літаратурную спадчыну Старажытнай Грэцыі. У першую чаргу тут трэба назваць падручнік рэктара акадэміі доктара медыцыны С. Біркоўскага (1602), дзе

былі выкладзены рытарычныя правілы Дыянісія Галікарнаскага, які жыў у I ст. да н. э. і чый трактат «Аб злучэнні слоў» у часы антычнасці ўваходзіў у лік абавязковых пры падрыхтоўцы аратараў. Тэкст у замойскім выданні быў падзелены на дзве часткі. У першай з іх паралельна на грэчаскай і лацінскай мовах быў змешчаны сам трактат, што пераўтварала яго яшчэ і ў дапаможнік па іх засваенні. Наступную частку напісаў сам С. Біркоўскі, які аналізаваў у ёй асобныя разважанні мысліцеля і яго найбольш выдатныя словазвароты ды выслоўі [7, с. 137]. Ініцыятыву свайго рэктара падхапілі і іншыя супрацоўнікі акадэміі – у 1604 г. С. Пхаэніцкі выдаў таксама двухмоўны тэкст «Малітвы аб пахаванні цела Гасподняга» св. Епіфанія Кіпрскага – аднаго з Айцоў царквы канца III – пачатку IV ст. [8, с. 23–27]

На высокім узроўні ў Замойскай акадэміі стаяла і выкладанне прававых навук. Згаданаму вышэй А. Бурскаму Жыгімонт III Ваза даручыў адрэдагаваць і адаптаваць да рэчаіснасці 3-томны твор М. Яскера, прысвечаны ўсебаковаму аналізу магдэбургскага права (1535). 1 ліпеня 1601 г. кароль асабіста зацвердзіў унесеныя ім праўкі і даў дазвол на 20-гадовае манапольнае выданне дадзенай кнігі ў Замойскай друкарні (выйшла 1602 гг.). Пры гэтым каментарыі А. Бурскага былі змешчаны на палях самаго зводу законаў, а таксама ў асобным раздзеле – «Сховішча тэрмінаў», дзе ў алфавітным парадку даваліся спасылкі на іх размяшчэнне ў тэксце [9, с. 43, 157, 206]. Адметнай падзеяй у справе падрыхтоўкі юрыстаў у Рэчы Паспалітай стаў выхад у 1613 г. падручніка па правазнаўству Т. Дрэцнэра. За кошт канцлера гэты навуковец стажыраваўся ў Арлеане, Парыжы, Буржы, Падуі і Рыме. Прычым у апошнім ён атрымаў ступень доктара цывільнага і кананічнага права. Разгляд жа законаў у дапаможніку ахопліваў перыяд, пачынаючы з XIV ст., ды закранаў прававое становішча асобных саслоўяў, гарадоў і г. д. [10, с. 6, 29, 176].

Пачэснае месца ў Замойскай акадэміі адводзілася медыцыне. З пачатку XVII ст. і ажно да 1635 г. яе выкладаў тут Э. Сікст, атрымаўшы адпаведную доктарскую ступень у Італіі. Вядомасць яму прынесла кніга па бальнеалогіі (1617), дзе ён не толькі аналізаваў на падставе шматлікіх твораў антычных ды сярэднявечных аўтараў лекавую сутнасць мінеральных вод, але і апісаў гаючую крыніцу ў Шкло пад Львовам. Кніга была напісана ім па-польскі: «Каб кожны мог зразумець карысць ад выкарыстання гэтых Цяпліц (гарачая мінеральная крыніца. – *А. С.*) нашых Русінскіх». Аздараўленчую ж функцыю ім, на яго думку, давала «Субстанцыя, атрыманая ад зорак» [11, с. XIII–XIV].

Менавіта дамінаванне азначаных свецкіх дысцыплін рабіла Замойскую акадэмію прывабнай для прадстаўнікоў розных хрысціянскіх канфесій. Пры гэтым сам Я. Замойскі разлічваў і на прыбыццё сюды пратэстанцкай моладзі, што было ўлічана пры складанні тутэйшай бібліятэцы, дзе меліся творы С. Буднага, А. Волана, М. Квяткоўскага, Л. Крышкоўскага, Я. Секлюцыяна, Ф. Соцына, П. Статорыюса, М. Чаховіца а таксама Брэсцкая і Нясвіжская біблії [12, с. 45-48]. Але кальвіністы ды лютэране з ВКЛ усё ж аддавалі перавагу навучанню ў еўрапейскіх універсітэтах. Разам з тым

выдадзеныя ў Замосці падручнікі былі вядомы ў іх асяроддзі – 12-гадовы Кр. Радзівіл у 1597 г. асабіста звярнуўся да Я. Замойскага з просьбай даслаць яму акадэмічныя выданні. Прычым, хаця малады князь-кальвініст ужо прыватным чынам праходзіў курсы рыторыкі і логікі, асабліва ён прасіў канцлера аб адпраўцы граматыкі Я. Урсына [13, с. 130].

Не вельмі прываблівала Замойская акадэмія і айчынных уніятаў, для якіх Ватыкан выдзеліў стыпендыі ў Рыме ды шэрагу алюмнатаў (Брунсберг, Аламоўц, Вільня і інш.). Толькі ў 1621–1622 навуч. г. тут было зафіксавана прыбыццё ажно трох прадстаўнікоў гэтай рэлігіі з Вільны (Э. Пакой, Е. Гізель, Я. Валковіч) [14, с. 97]. Супрацоўнічалі ўніяты і з мясцовай друкарняй. З ураджэнцаў Беларусі, скарыстаўшыхся падобнай магчымасцю можна назваць мінчаніна Я. Сушу, які з 1639 г. кіраваў базыльянскай школай у Холме на Ўкраіне. У 1646 г. ён надрукаваў тут твор, прысвечаны абразу Маці Божай Холмскай. Дадзеная кніга з'яўлялася як узорам красамоўных талентаў аўтара (пры апісанні мясцовых краявідаў), так і яго эрудыраванасці – Я. Суша, распачаўшы аповед з часоў кіеўскага князя Уладзіміра, спасылаўся на працы вядомых гісторыкаў (А. Кромера, Я. Длугаша і інш.) [15, с. 3–4, 11–15].

Што ж датычыцца праваслаўных выхадцаў з Беларусі, то Замойская акадэмія была для іх адным з асноўных цэнтраў атрымання вышэйшай адукацыі. Прычым накіроўваліся сюды нават асобы, якія ўжо працавалі настаўнікамі ў брацкіх школах. Так, у 1628 г. тагачасны архімандрыт Кіева-Пячорскай лаўры П. Магіла прафінансаваў навучанне тут І. Трафімовіча-Казлоўскага і С. Косава са Львова. Пасля свайго вяртання ў 1631 г. ва Украіну першы з іх стаў рэктарам Кіеўскай Лаўрскай школы, а другі – тутэйшым прэфектам. С. Косаў быў ураджэнцам Віцебшчыны і скончыў Віленскую брацкую школу (з 1647 г. кіеўскі мітрапаліт). Сам ён так апісваў гэты перыяд свайго жыцця: «Мы, изучив науки Паллады в католических академиях, стали насаджать в русские умы латинский язык лучше, нежели бывшие до нас наставники; и это не из иных побуждений, как только потому, чтобы мы могли заслужить у Предвечного какое либо воздаяние такими добрыми делами, которые в особенности повелевают просвещеть не знающих, а также, чтобы вышедшие из среды православного народа нашего успели распространить в нем свет Аполлона…» [16, с. 5, 7].

Вучыліся ў Замойскай акадэміі і выхаванцы айчынных брацкіх школ. Сярод іх трэба ўзгадаць бацьку і сына Яўлеевічаў з Магілёва. Першы з іх – Ф. Яўлеевіч, па завяршэнні навучання ў магілёўскіх і кіеўскіх братчыкаў, прыбыў у Замосце ў 1621–1622 навуч. г., але праз год перабраўся ў Кракаўскі ўніверсітэт, пасля заканчэння якога ў 1625 г. вярнуўся ў Кіеўскую брацкую школу і праз тры гады стаў яе рэктарам [17, с. 530–531]. Другі – будучы архімандрыт Полацкага Барысаглебскага манастыра І. Яўлеевіч, ва ўласнай аўтабіяграфіі адзначаў, што пасля навучання ў Магілёўскай брацкай школе і Кіева-Магілянскім калегіуме ў 1640 г.: «Закончыўшы курс

пабыў у сваіх на Белай Русі, праз два гады слухаў курс Тэалогіі маральнай і спекулятыўнай дзве часткі па Скоту (Іаан Дунс Скот адзін з буйнейшых схаластычных філосафаў-тэолагаў сярэднявечча. – *А. С.*), трэцюю ў вызначаным парадку, у Замойскай Акадэміі і медыцыну спекулятыўную з анатоміяй аднак не ўсе 80 частак прайшоў…» [18, с. 78, Прил.]. Адначасова з І. Яўлеевічам у Замосці знаходзіўся І. Гізель, скончыўшы Кіева-Магілянскі калегіум у 1642 г. Ён таксама працягнуў сямейную традыцыю, бо яго бацька Е. Гізель, як ужо адзначалася вышэй, вучыўся тут у пачатку 1620-х гг. Пры гэтым тутэйшая акадэмія была для будучага архімандрыта Кіева-Пячорскай лаўры і аўтара першага ў праваслаўным асяроддзі падручніка па гісторыі ўсходніх славян («Сінопсіс», 1674) толькі прамежкавым этапам перад навучаннем у Кембрыджскім універсітэце ў Англіі [19, с. 184–185, 219–222].

Разам з тым дамінавалі сярод выхаванцаў Замойскай акадэміі, відавочна, каталікі. З ліку спавядаючых гэтую рэлігію ўраджэнцаў Беларусі тут вылучаюцца некалькі адметных фігур. Так, у другой палове 1610-х гг. у ёй вучыўся П. К. Абуховіч, прыбыўшы сюды з належачай яму в. Вялікая Ліпа пад Нясвіжам. Ужо ў час свайго навучання ў Замосці ён вызначыўся ўласным красамоўствам і здольнасцямі ў вывучэнні старажытных моў – у 1617 г. у мясцовай друкарні нават выйшаў яго лацінска-грэчаскі панегірык у гонар тагачаснага гаспадара мястэчка Т. Замойскага. На жаль, у далейшым ён праявіў сябе «куды лепшым аратарам, чым салдатам», квінтэсенцыяй чаго стала ганебная здача П. К. Абуховічам рускай арміі Смаленска ў 1654 г. (займаў пасаду тутэйшага ваяводы). Напісаны з гэтай нагоды Ц. Камунякай знакаміты сатырычны «Ліст да Абуховіча» (1655) абвінавачваў яго ў здрадзе, вайсковай бяздарнасці і псеўдаадукаванасці [20, с. 474–475]. Больш паспяховым палкаводцам быў іншы каталіцкі выхаванец Замойскай акадэміі – кн. А. Г. Палубінскі (яго бацька кашталян мсціслаўскі кн. К. А. Палубінскі валодаў Дзярэчынам, Глускам і Глыбокім). Пасля навучання тут на мяжы 1630–1640-х гг. па загаду караля Уладыслава IV ён адправіўся ў Галандыю і Францыю «для вывучэння моў, правоў ды звычаяў тамашніх». У далейшым жа князь адзначыўся ў час вайны 1654–1667 гг. з Расіяй, атрымаўшы за свае вайсковыя поспехі пасады падстолія вялікага літоўскага, маршалка вялікага літоўскага, а таксама прыбытковыя староствы ваўкавыскае, бабруйскае і інш. [21, с. 358].

На жаль, з другой паловы XVII ст. Замойская акадэмія прыйша ў заняпад. Прычынамі гэтага стала спусташэнне мястэчка казакамі (1648) і шведамі (1656), а таксама пагаршэнне фінансавання, што выклікала востры недахоп выкладчыкаў. У выніку ў 1674–1746 гг. тут працаваў толькі факультэт вызваленых мастацтваў, і хаця ў далейшым астатнія дысцыпліны зноў пачалі чытацца, сваю прывабнасць для ўраджэнцаў Беларусі Замойская акадэмія ўжо страціла. Ліквідавана была ў 1784 г. па ініцыятыве аўстрыйскіх улад, пад чый кантроль гэты гэгіён Польшчы трапіў пасля першага падзелу Рэчы

Паспалітай. На яе месцы пачаў працу Каралеўскі ліцэй, які неўзабаве быў пераўтвораны ў гімназію, праіснаваўшую да 1811 г. – навучальную установу перавялі ў суседні Шчэбжэшын, а экс-акадэмічныя будынкі аддалі вайскоўцам [22, с. 7].

У цэлым аналіз дзейнасці Замойскай акадэміі ў канцы XVI – першай палове XVII ст. дазваляе зрабіць выснову, што надзеі Я. Замойскага на арганізацыю буйного альтэрнатыўнага езуітам і Кракаўскаму ўніверсітэту поліканфесійнага цэнтра асветы цалкам усё ж не спраўдзіліся. Шмат якія канфесіі – каталікі, пратэстанты і ўніяты – мелі альтэрнатыўныя варыянты ўдасканалення сваёй асветы, а праваслаўная моладзь часцяком аддавала перавагу Кіева-Магілянскаму калегіуму і Віленскай езуіцкай акадэміі (Мялецій Сматрыцкі, Сімяон Полацкі). Разам з тым наяўнасць у Замосці выдатнага выкладчыцкага калектыву, наватарскіх педагагічных распрацовак і падручнікаў, а таксама дамінаванне свецкага пачатку ў вучэбна-выхаваўчым працэсе рабілі тутэйшую акадэмію адметным месцам атрымання вышэйшай адукацыі, які карыстаўся заслужаным прызнаннем у асяроддзі айчыннай правячай і інтэлектуальнай эліты.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Łempicki, S.* Medyceusz polski XVI wieku: rzecz o mecenacie Jana Zamoyskiego / S. Łempicki. – Lwów: Druk. «Sztuka», 1929. – 78 s.

2. *Kurdybacha, Ł.* Problem świeckości Akademii Jana Zamoyskiego / Ł. Kurdybacha // Rozprawy z Dziejów Oświaty. – 1962. – T. 5. – S. 3–24.

3. *Łukaszewicz, J.* Historya szkół w Koronie i w Wielkim Księstwie Litewskim od najdawniejszych czasów aż do roku 1794: w 4 t. / J. Łukaszewicz. – Poznań: Wyd-wo W. Deckera i Spólki, 1849–1851. – T. 3. – 1851. – 516 s.

4. *Ursinus, J.* Grammatica in IV classes: Orthographiae, Analogiae, Syntaxis et Prosodiae, ad usum juventutis academicae, dispartita ac recenter utiliorib. regulis syntaxeos aucta / J. Ursinus. – Zamoscii: Typographia Academiae, 1759. – XX, 383 p.

5. *Donatus, A.* Viri Clarissimi Grammatica. Pro Elementariis Hippei Samosciani. Loci veterum Scriptorum, illius Iulj Caesaris de Analogia / A. Donatus. – Zamoscii: Typographia Academiae, 1594. – 87 p.

6. *Burski, A*. Dialectica Ciceronis, quae disperse in scriptis reliquit, maxime ex Stoicorum sententia, cum commentariis quibus ea partim supplentur, partim illustrantur. Opus non solùm ad intelligenda Ciceronis scripta, sed etiam multorum veterum auctorum, ac in his Theologorum, Jurisconsultorum, Medicorum ac Philosophorum, imprimis utile / A. Burski. – Zamoscii: Typographia Academiae, 1604. – 470 p.

7. *Birkowski, S.* Dionysius Halicarnasseus. De collocatione verborum graece et latine / S. Birkowski. – Zamoscii: Typographia Academiae, 1602. – 136 p.

8. *Phaenicki, S.* Epiphanius Cyprus. Oratio in Sepulturam Corporis Domini / S. Phaenicki. – Zamoscii: Typographia Academiae, 1604. – IV, 34 p.

9. *Jaskier, M*. Juris provincialis quod Speculum Saxonum vulgo nuncupatur, libri tres. Opera vigilanti in correctiorem redacti materiam, adiunctis simul glossis, alijsque additionibus, pro interpretatione textus magis necessarijs / M. Jaskier. – Zamoscii: Typographia Academiae, 1602. – 725 p.

10. *Drezner, T.* Institutionum iuris Regni Poloniae libri IIII. ex Statutis et Constitutionibus collecti in usum nobilitatis Polonae, iuris Patrij studiosae / T. Drezner. – Zamoscii: Typographia Academiae, 1613. – X, 294 p.

11. *Sixtus, E.* O cieplicach we Skle, Ksiąg Troie. Trzećią księgę czytáy záraz opuśćiwszy dwie, iesli się niechcesz báwić długiemi diskursámi / E. Sixtus. – Zamość: Drukarnia Akademii Zamojskiej, 1617. – XIV, 211 s.

12. *Kochanowski, J. K.* Dzieje Akademii Zamojskiej (1595–1784) / J. K. Kochanowski. – Kraków: Druk W.L. Anczyna i Spółki, 1899–1900. – XCVIII, 345 s.

13. Scriptores Rerum Polonicarum: w 22 t. / wyd. Komisyi Historycznej Akademii Umiejętności w Krakowie. – Kraków: Druk W.L. Anczyna i Spółki, 1872–1917. – T. VIII: Archiwum domu Radziwiłłów. Listy ks. M.K. Radziwiłła, J. Zamojskiego, L. Sapiehy / wyd. A. Sokołowski. – 1885. – 295 s.

14. *Gmiterek, H.* Akademia Zamojska jako uczelnia pogranicza polsko-ruskiego / H. Gmiterek // Дрогобицький краєзнавчий збірник. – Дрогобич: «Коло», 2011. – Вип. XIV–XV. – С. 95–103.

15. *Susza, J.* Phoenix Redivivus Albo Obraz Starozytny Chełmski, Panny Y Matki Przenaswietszey, Sławą Cudow swoich ożyły / J. Susza. – Zamość: Drukarnia Akademii Zamojskiej, 1646. – 78 s.

16. *Голубев, С. Т.* Exegesis Сильвестра Косова / С. Т. Голубев // Киевские епархиальные ведомости. – 1874. – № 16. – Отд. 2. – Прил. – С. 1–14.

17. *Шинкарук, В.* Пам’ятки братських шкіл на Україні (кінець XVI – початок XVII ст.) / В. Шинкарук. – Київ: Наукова думка, 1988. – 568 с.

18. *Голубев, С. Т.* История Киевской духовной академии. Период до-Могилянский / С. Т. Голубев. – Киев: Унив. тип., 1886. – 235 с. – Прил. – 121 с.

19. *Сумцов, Н. Ф.* Иннокентий Гизель (К истории южно-русской литературы XVII века) / Н. Ф. Сумцов // Киевская старина, 1884. – Т. 10. – С. 183–226.

20. *Przyboś, A.* Obuchowicz Filip Kazimierz / A. Przyboś // Polski Słownik biograficzny. – Warszawa; Kraków: Wyd-wo PAN, 1978. – T. XXIII. – S. 473–476.

21. *Nagielski, M.* Połubiński Aleksander Hilary / M. Nagielski // Polski Słownik biograficzny. – Warszawa; Kraków: Wyd-wo PAN, 1983. – T. XXVII. – S. 358–363.

22. *Wadowski, J. A.* Wiadomość o profesorach Akademii Zamojskiej / J. A. Wadowski. – Warszawa: Druk. «Gazety Rolniczej», 1900. – 341 s.

**(Дата падачы: 08.01.2018 г.)**

*І. А. Саракавік*
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск
*I. A. Sorokovik*
Academy of management under the President
of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 329.15(091)(476):351.74**

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ КІРАЎНІЦТВА МІЛІЦЫЯЙ ПАРТЫЙНЫМІ ОРГАНАМІ БЕЛАРУСІ Ў 1966–1970 ГГ.

## SOME ASPECTS OF THE MANAGEMENT OF THE POLICE PARTY BODIES OF BELARUS IN 1966–1970

*Артыкул прысвечаны некаторым аспектам кіраўніцтва міліцыяй партыйнымі органамі Беларусі ў 1966–1970 гг. Тэма слаба даследавана гістарычнай навукай. Падрыхтавана на аснове архіўных матэрыялаў, упершыню ўведзеных ў навуковы абыход.*

*Ключавыя словы: партыйнае кіраўніцтва; міліцыя; Савецкі Саюз; Беларуская ССР; ЦК КПБ; Канстытуцыя СССР; кірункі дзейнасці.*